# ГІСТОРЫЯ

УДК 271.2(091)+94(476)

***Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф., праф. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Vabishchevich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor,*
*Professor of the Department of the History of the Slavic Peoples*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: vabischev@rambler.ru

## АЛЬМАНСКІ ПРАВАСЛАЎНЫ ПРЫХОД У КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX ст.

*Артыкул прысвечаны гісторыі Альманскага праваслаўнага прыходу ў канцы XVIII – пачатку XX ст., куды ўваходзілі вёскі Альманы, Альманская Кашара (Кашара) Пінскага павета Мінскай губерні Расійскай імперыі (цяпер Столінскі раён Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь) і Пераброды (цяпер Сарненскі раён Ровенскай вобласці Украіны). Упершыню ўведзены ў навуковы ўжытак ведамасці Альманскай Уваскрасенскай (Васкрасенскай) царквы за 1826, 1901 і 1910 гг., асобныя архіўныя дакументы. Прааналізавана матэрыяльнае становішча свяшчэннікаў і царкоўнаслужыцеляў, стан старога праваслаўнага храма, узведзенага ў Альманах да 1793 г., і новай царквы, пабудаванай у 1893 г. намаганнямі вернікаў. Устаноўлены асобы цэлага шэрага прыходскіх свяшчэннікаў, звесткі пра свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў і іх сем'і. Раскрыты ўзаемаадносіны мясцовых сялян з адміністрацыяй Давыд-Гарадоцкай ардынацыі князёў Радзівілаў. З-за неспрыяльных прыродна-кліматычных умоў у балоціста-лясістай мясцовасці, невысокага ўзроўню дастатку вернікаў становішча царкоўнага прычту было бядотным.*
***Ключавыя словы:*** *Альманы, праваслаўны прыход, царква, прыхадскі свяшчэннік, сяляне, Радзівілы.*

## *The Olmany Orthodox Parish in the End of the XVIIIth – Beginning of the XX Century*

*The article is devoted to the history of the Olmansky Orthodox parish in the late XVIIIth and early XXth centuries, which included the villages of Olmany, Olmanskaya Kashara (Kashara) of the Pinsk District of the Minsk Governorate of the Russian Empire (now the Stolinsky District of the Brest Region of the Republic of Belarus) and Perebrody (now the Sarnensky District of the Rivne Region of Ukraine). For the first time, the records of the Olmansky Uvaskrasensky (Vaskrasensky) Church for 1826, 1901 and 1910, individual archival documents were put into scientific use. The material situation of priests and church workers, the condition of the old Orthodox church, built in Olmany before 1793, and the new church, built in 1893 by the efforts of believers, were analyzed. The identities of a number of parish priests, information about priests and church ministers, and their families have been established. The relationship between the local peasants and the administration of the David-Haradok ordination of the Radzivils Princes is revealed. Due to unfavorable natural and climatic conditions in the marshy-wooded area, low level of wealth of believers, the position of priests and church ministers was poor.*
***Key words:*** *Olmany, Orthodox parish, church, parish priest, peasants, Radzivils.*

### Уводзіны

У XIX – пачатку XX ст. у склад Альманскага праваслаўнага прыходу Церабяжоўскай воласці Пінскага павета Мінскай губерні Расійскай імперыі, які быў у межах уладанняў Давыд-Гарадоцкай ардынацыі князёў Радзівілаў, уваходзілі вёскі Альманы, Кашара (Альманская Кашара) сучаснага Столінскага раёна Брэсцкай вобласці Рэспублікі Беларусь, а таксама Перабροды (цяпер Сарненскі раён Ровенскай вобласці Украіны). Вёска Альма́ны (руск.: Ольма́ны, англ.: Olmany) размешчана за рэкамі Гарынь і Льва на ўскраіне ландшафтнага заказніка «Альманскія балоты», аднаго з найбольшых у Еўропе балотных масіваў. Там ёсць папуляцыі птушак з Чырвонай кнігі (напрыклад, вялікага арляца), цэлы шэраг відаў рэдкіх раслін. Зараз наладжана традыцыя правядзення фестывалю журавін.

У гэтым аддаленым кутку Палесся захаваліся архаічныя рысы традыцыйнай культуры. Невыпадкова, што ў 1930-я гг. у Альманах праводзіў этнасацыялагічныя даследаванні Ю. Абрэмбскі, а ў канцы XX – пачатку XXI ст. этнакультурную спадчыну Альман актыўна вывучалі беларускія і за-

межныя культуролагі, этнографы, фалькларысты, здымалі фільмы і тэлеперадачы.

Хоць праваслаўная Уваскрасенская (Васкрасенская) царква (1793 г.) у Альманах не ўваходзіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, аднак яна з'яўляецца каштоўным помнікам народнага дойлідства, дзе перапляліся рысы рэтраспектыўна-рускага стылю і класіцызму. Яна цудам уцалела ў ліпені 1944 г., калі германскія нацысцкія акупанты цалкам спалілі вёску (з 202 двароў засталіся ўсяго два).

Гісторыя вёскі Альманы пакуль не была прадметам грунтоўных даследаванняў. Кароткія звесткі пра Альманы можна знайсці толькі ў асобных навуковых, навукова-папулярных, энцыклапедычных і даведачных выданнях [1, с. 602; 2, с. 561–562; 3, с. 140–144]. Альманская Васкрасенская царква не ўзгадваецца ці проста пералічана сярод іншых праваслаўных цэркваў [4; 5, с. 308]. Некаторыя аўтары ўжо звярнулі ўвагу як на старую царкву (да 1793 г.), так і на цяперашнюю ў кантэксце гісторыі культуры заходнепалескага рэгіёна [6, с. 243; 7]. Мы вывучалі стан праваслаўных прыходаў Століншчыны ў канцы XVIII – пачатку XX ст. (на прыкладзе Рубельскага прыходу, суседняга з Альманскім) [8; 9].

Мэтай артыкула з'яўляецца раскрыццё становішча аднаго з аддаленых сельскіх праваслаўных прыходаў Палесся – Альманскага – у канцы XVIII – пачатку XX ст. Для дасягнення пастаўленай мэты пастараемся выканаць наступныя задачы:

1) вызначыць персаналіі свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў;

2) ахарактарызаваць матэрыяльны стан прычту;

3) прасачыць узаемаадносіны вернікаў, духавенства з адміністрацыяй Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў у дарэформенны і парэформенны перыяды;

4) выявіць новыя звесткі пра Альманскую Васкрасенскую царкву.

**Альманскі прыход з канца XVIII ст. да 1893 г.**

Час узвядзення старой царквы ў Альманах невядомы. Ад яе захавалася царская брама (драўляная, разьбяная, жывапіс, памеры: 160 × 90 см), што датуецца другой паловай XVII ст. (яе рэстаўрыравалі А. Шпунт, П. Журбей). Цяпер яна захоўваецца ў Музеі старажытнабеларускай культуры ў Мінску [10, с. 156].

Некаторыя звесткі пра старую Альманскую Васкрасенскую царкву і мясцовы прыход ёсць у Ведамасці Давыд-Гарадоцкай і Пінскай пратапопій за 1793 г., апублікаванай А. Ільіным:

*«В селе Олманах церков Воскресения Христова старая деревяна, при оной церкви священник Иоанн Сулковский 29 [лет], жена его Иулиана 21 [год], дочь их Евдокия 2 [года], умершаго с[вященника] Константина Яхимовича жена Евдокия 60 [лет], дети ея Михаил, к церковнослужению неспособен 33 [года], жена его Пелагея 30 [лет], Стефан дяком 29 [лет], Федор неучен 21 [год], Богдан неучен 19 [лет]. При сей писаной церкви приходских дворов 80»* [7, с. 38].

У рэвізскай сказцы 1795 г. прыведзены больш дакладныя звесткі пра прыходскага свяшчэнніка Альман і сям'ю папярэдняга святара-нябожчыка:

*«Иерей настоятель священнодействующей церкви Иоанн сын Иванов Сулковский 31 [год], у него жена Иулианна дочь Павлова 22 [года], Евдокия, дочь Демиана, по священнику Константину Яхимовичу удова 85 [лет], живет на фундуше церковном, у нее дети сыновья 1 Михаил 42 [года], в должности пономарской, к священству не способен, у него жена Мария, дочь Павлова 34 [года], у них дочь Анна 3 [года], 2 Стефан 35 [лет], в должности дяковской, к священству не способен, Богдан 26 [лет]»* [11, арк. 37адв.].

Нягледзячы на разыходжанні ва ўзросце і іншыя недакладнасці, гэтыя два дакументы дазваляюць вызначыць двух прыходскіх свяшчэннікаў Альман: ***Канстанціна Яхімовіча*** (да 1793 г.) і ***Іаана Сулкоўскага*** (не пазней 1793 г. і не раней 1795 г.). Паводле рэвізіі 1795 г., у вёсцы Альманы налічвалася 201 рэвізская сялянская душа, у 1811 г. – 173 [12, арк. 211–212].

Звернемся да Ведамасці аб свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелях Васкрасенскай царквы сяла Альманы за 1826 г., падпісанай свяшчэннікам ***Канстанцінам Раздзялоўскім***, панамаром Мікалаем Нямшэвічам і заверанай благачынным, протаіерэем Пятром Яхімовічам:

*«Церковь одноприходная во имя Воскресения Господня, деревянная, однопрестольная, издревле благочестивая, коштом прихожан построенная, подчинки требующая покрытия. Оная церковь состоит во владении помещика князя Людвика Радзивилла... сосуды серебрянные вызолоченные... утварей, облачения и книг скудно... Денежной церковной суммы за непоступлением в приход не имеется»* [13].

Да Альманскай царквы была прыпісана капліца Св. Параскевы (*«деревянная, ветхая»*) у Перабродах, што належала таксама да ўладанняў таго ж князя Л. Радзівіла.

У прыходзе было тады 84 двары. У кожным з іх налічвалася ў сярэднім па 4 асобы мужчынскага полу. А ўсяго ў прыходзе налічвалася 700 душ сялян: 337 мужчынскага і 363 жаночага полу. З іх у Альманах было 155 душ мужчынскага і 181 жаночага полу, у Перабродах – па 182 душы мужчынскага і жаночага полу.

*«Пахотной земли волок две, сенокосной на 50 возов. На оную землю фундуш данный 1**8**72* (памылка; трэба – 1**7**72. – *А. В.) года октября 26 дня от Его Сиятельства князя Иосифа Радзивилла имеется и хранится при церкви в целости. На данных фундушевых [землях] крестьян не имеется. Хлебной ссыпки не производит-ся, а довольствуются священно- и церковнослужители одними только с прихожан доходами»* [13].

У царкве захоўваліся ў цэласці метрычныя кнігі, шлюбныя вобыскі, спавядальныя роспісы, вопіс царкоўных рэчаў. *«Поучительные слова в церкви читаются без упущения»*. Аб прыналежнасці да праваслаўя сведчыць запіс: *«Расколов и унитов нет»*. Паводле В. Мароза, царква ў Альманах не ўзгадвалася ў спісах уніяцкіх парафій у 1772 і 1837 гг., што дае падставу вызначыць яе праваслаўную прыналежнасць [6, с. 243].

Паводле ведамасці 1826 г., свяшчэннікам у Альманах тады быў ***Канстанцін Стэфанаў (Сцяпанавіч) Раздзялоўскі*** (40 гадоў), *«из духовного звания»*, які вучыўся ў Мінскай духоўнай семінарыі. 6 чэрвеня 1806 г. ён быў прызначаны Мінскай духоўнай кансісторыяй дзякам Святавольскай Крыжаўзвіжанскай царквы Пінскага павета. 8 мая 1815 г. быў рукапаложаны магілёўскім епіскапам Даніілам у дзякана, а на наступны дзень – у свяшчэнніка і прызначаны настаяцелем царквы ў Альманах. Ажаніўся з дачкой святара (імя жонкі не пазначана). У іх сям'і тады былі дзеці: сын Дзмітрый (14 гадоў), які вучыўся ў Слуцкім павятовым вучылішчы, і тры дачкі – Еўдакія (7 гадоў), Пелагея (5 гадоў) і Аляксандра (2 гады). Яны жылі ва ўласным доме, пабудаваным на царкоўнай зямлі.

Дзячка ў царкве не было. Панамаром быў Мікалай Калінікаў (Калінікавіч) Нямшэвіч (32 гады), *«из духовного звания»*, які не вучыўся ў семінарыі, а «рускую грамату» засвоіў ад бацькі. 15 чэрвеня 1807 г. Мазырскае духоўнае праўленне прызначыла яго панамаром у Альманскую царкву. Быў жанаты з дачкой шляхецкага паходжання (імя таксама не названа). У іх сям'і быў сын Антоній (6 гадоў) і дачка Васа (3 гады). Сям'я дзячка таксама жыла ва ўласным доме, узведзеным на царкоўным пляцы.

Названы ў ведамасці і халасцяк Багдан Канстанцінаў (Канстанцінавіч) Яхімовіч (55 гадоў), што жыў у сваім доме, брат памерлага дзяка гэтай царквы Стэфана Яхімовіча. Багдан не вучыўся ніякай грамаце, але заўжды добра спяваў [13]. Як бачым, ён застаўся ў Альманскім прыходзе адзіным прадстаўніком з сям'і свяшчэнніка Канстанціна Яхімовіча.

Маёнтак Альманская Кашара, куды ўваходзілі Альманы, Альманская Кашара, Пераброды, быў уключаны ў 1837 г. у чацвёртую частку Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў для пакрыцця даўгоў папярэдніх ардынатаў і перададзены ў распараджэнне Мінскай палаты грамадзянскага суда (у 1867–1883 гг. – Мінскай аб'яднанай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда). У вёсцы Альманы налічвалася тады 144 рэвізскія душы [14, арк. 1]. У Альманскай Кашары першымі жыхарамі былі арандатары радзівілаўскай зямлі з дробнай шляхты, што перасяляліся туды з іншых суседніх вёсак [3, с. 138].

Прыгонныя сяляне выконвалі павіннасці (паншчыну, аброк і інш.) паводле інвентара маёнтка. Шлюбы сялян заўжды ўзаконьваліся царкоўным абрадам і з благаславення памешчыка [15, с. 380–381]. Для пацвярджэння прывядзём тэкст арыгінальнага дакумента-пасведчання, выдадзенага адмі-

ністрацыяй Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў.

*«Свидетельство. Дано сие Минской Губернии Мозырского Уезда от Администрации Давидгородецкой Ордынации Его Сиятельства Князя Льва Радзивилла крестьянину селения Ольмян состоящего Пинского Уезда и к оной Ордынации принадлежащего Андрею Петра сыну Буяну в том, что дозволяется ему вступить в законный брак с крестьянкою оного ж селения девицею Оришкою дочерею Мойсея Терешкова Буяна и что на обвенчание их со стороны оной Администрации никакого препятствия не имеется. Во уверение чего и дано ей за надлежащим подписом и с приложением Давидгородецкой Ордынации Экономического Управления печати. Дано в Давидгородке Генваря 25 дня 1844 года. Люстратор Имений Давидгородецкой Ордынации* [подпись]*»* [16].

З 1836 г. пачалі адкрывацца царкоўныя школы («поселянские училища»), якія давалі пачатковую адукацыю. Прыходскія праваслаўныя свяшчэннікі бясплатна навучалі дзяцей сялян, мяшчан і царкоўнаслужыцеляў [17, с. 70]. Такая школа была адкрыта ў кастрычніку 1844 г. і ў Альманах. У ёй быў усяго адзін настаўнік (свяшчэннік), вучняў было 20 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак. У канцы навучальнага года выбылі 3 хлопчыкі і 2 дзяўчынкі [7, с. 61].

Як сведчыць рапарт веляміцкага благачыннага С. Каржэнеўскага архіепіскапу Мінскаму і Бабруйскаму Антонію 26 лютага 1844 г., асобныя праваслаўныя цэрквы трэба было неадкладна рамантаваць, асобныя былі ў аварыйным стане:

*«Ольманская Воскресенская очень ветха, а равно и колокольня, и требует вновь постройки... хотя начальство сделало свое распоряжение о починке оных, но так как Давыдгородская администрация помещика Льва Радзивилла отнесла сей труд к обязанности всех прихожан, то и починки означенных церквей ожидать не можно»* [18, арк. 1–1адв.].

А ў рапарце 15 мая 1845 г. ён скардзіўся на адміністрацыю Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў, мясцовую шляхту, мяшчан і сялян, якія не спяшаліся выконваць свае абавязацельствы па матэрыяльнай падтрымцы праваслаўнага духавенства:

*«Хотя проектами, утверждёнными комитетом, положено обрабатывать прихожанам священнический участок земли, строить дома по планам причтам и давать дрова, начав такое пособие духовенства с 1 января 1844 года, но и по сие время в ведение моего благочиния, а в имении князя Радзивилла, нет по сему исполнения со стороны прихожан – шляхты и крестьян»* [19, арк. 1].

Падобныя прэтэнзіі былі і ў яго рапарце 10 ад сакавіка 1846 г.: *«Шляхта, мещане и крестьяне помещика князя Льва Радзивилла не исполняют обязанностей»* [19, арк. 5].

30 чэрвеня 1847 г. у рапарце ў Мінскую духоўную кансісторыю С. Каржанеўскі дакладваў, што *«Давидгородская администрация до сего времени еще не приступила к починке церквей: Велемицкой, Малешевской, Белоушской и Ольманской... и никакого даже материала... не заготовила»* [18, арк. 13].

Мінская духоўная кансісторыя 31 снежня 1847 г. прыняла ўказ пра рамонт цэркваў. Аднак гэтае рашэнне выконвалася вельмі марудна. Той жа благачынны С. Каржанеўскі паведамляў 29 мая 1848 г. у кансісторыю, што *«к починке церквей Велемицкой, Малешевской, Ольманской и Белоушской шляхта и Давидгородская администрация и до сего времени не приступили»* [18, арк. 18]. Наконт гэтага Мінская духоўная кансісторыя прыняла адпаведны ўказ 30 кастрычніка 1848 г. У рапарце 13 снежня 1848 г. С. Каржанеўскі паведамляў: *«К починке Велемицкой, Малешевской, Белоушской и Ольманской церквей еще не приступили»* [18, арк. 23]. Становішча не змянілася і да пачатку вясны. Зноў 10 сакавіка 1849 г. у рапарце ў кансісторыю ён адзначаў, што *«и до сего времени у владельцев означенных церквей нет никакой о том заботливости; к починке же церквей Пинского уезда Белоушской и Ольманской не сделано даже пинским земским исправником никакого распоряжения»* [18, арк. 27]. У яго рапарце ад 3 ліпеня 1856 г. паведамлялася, што цэрквы ў Лядцы, Альманах і іншых вёсках не будаваліся, а будматэрыялы гнілі [18, арк. 59].

У гісторыка-статыстычным апісанні Мінскай епархіі (1864 г.) змешчаны скупыя

звесткі пра драўляную Васкрасенскую царкву ў Альманах і мясцовы прыход.

*«Штатного годичного жалования причту 140 р[уб.]. Земли усадебной, пахотной и сенокосной, около 50 десятин. Прихожан мужского пола 280 д[уш] и женского пола 294 д[уши]. К ней принадлежит Перебродская часовня»* [20, с. 288].

Аб бядотным становішчы храмаў (у тым ліку Альманскага) у палескіх благачыннях сведчыць Ведамасць пра цэрквы Мінскай епархіі, якім патрабавалася царкоўнае начынне і іншыя рэчы (1860-я гг.): *«Состоящие в Велимицком благочинии [церкви] весьма бедные»* [7, с. 74]. У Васкрасенскай царкве ў Альманах тады была вакантнай пасада прыходскага свяшчэнніка. Пазней там быў ***Іуліян (Ульян) Лісіцкі***. У адным з нумароў «Минских епархиальных ведомостей» паведамлялася, што 1 верасня 1868 г. яго з Альман перавялі ва Успенскую царкву сяла Навасады Мінскага павета [21, с. 207].

Апісанне цэркваў і прыходаў Мінскай епархіі (1879 г.) утрымлівае інфармацыю пра мясцовасць, царкву і Альманскі прыход. Звестак пра час узвядзення Альманскай царквы там таксама няма:

*«Зданием она деревянная, в виде продолговатого прямоугольника, с одним открытым куполом на средине церкви и одним глухим над алтарной частью, с гонтовою крышею, одною входною дверью и четырьмя рядами окон без железных решеток; снаружи не окрашена. Внутренняя площадь вместимости, вместе с алтарем, заключает в себе около 15 кв. сажней; потолок устроен сводом и подшит досками; стены не окрашены и не выбелены; пол деревянный; клиросов и солеи нет. Двухъярусный дощатый иконостас – старого устройства, без покраски; в нем 20 икон в покрашенных рамках. Ризница помещается в шкафе; в стенах церковь не прочна; к отоплению не приспособлена; престол в ней один во имя Воскресения Христова. Ценною можно считать одну серебрянную дарохранительницу. Имеется всего две ризы, из них одна старая. Евангелие богослужебное одно, в листе, обложенное малиновым бархатом, с серебряными изображениями Воскресения и Евангелистов, а на нижней стороне Матери Божией, а по углам Ангелов. В церковном архиве метрические книги хранятся с 1870 г. Церковный погост обнесен деревянною оградою. Колокольня устроена отдельно; в ней четыре колокола, из которых самый больший в 3 п[уда]. В приходе два кладбища, и на одном из них в дер. Перебродах есть кладбищенская церковь во имя Св. Параскевы»* [22, с. 139].

У Альманскім прыходзе тады налічвалася 333 асобы мужчынскага і 345 асоб жаночага полу. Усе яны былі сялянамі і займаліся земляробствам («хлебопашеством»). Пасада настаяцеля была вакантнай, а абавязкі псаломшчыка з 1867 г. выконваў Аляксандр Праваловіч. Гадавы прыбытак царквы складаў усяго каля 30 руб. Свяшчэннік атрымліваў штатнае «жалование» і карыстаўся царкоўнай зямлёй і памяшканнем. Царкоўнай зямлі было 3 валокі (у тым ліку 4 дзесяціны сенажаці) у 17 участках. У апісанні ўказвалася, што ў царкве захоўваўся дароўны (фундушавы) запіс на зямлю на польскай мове. Сядзіба свяшчэнніка была каля царквы:

*«Дом для помещения священника совершенно старый, опущенный; в нем может быть обитаема только одна комната; дом псаломщика и того хуже; прочие строения также очень ветхие. Комиссия, осматривавшая строения, предположила построить все вновь»* [22, с. 140].

У прыходзе была царкоўнапрыходская апека.

У 1882–1891 гг. прыходскім свяшчэннікам у Альманах быў ***Павел Пякарскі*** [23, с. 203; 24, с. 206; 25, с. 201; 26, с. 195; 27, с. 191; 28, с. 308; 29, с. 160; 30, с. 96]. У 1891 г. ён скончыў Мінскую духоўную семінарыю [31]. Пасля Альман далей служыў у Стружскім і Столінскім прыходах Пінскага павета.

У 1891–1903 гг. настаяцелем Альманскага прыходу быў ***Міхаіл Пракаповіч*** [32, с. 100; 33, с. 100; 34, с. 191; 35, с. 190]. Складальнікі даведачных выданняў, як і губернскія чыноўнікі, нярэдка блыталі Альманы (Пінскага павета) з Альшанамі (Мазырскага павета), таму першыя два гады памылкова адзначылі яго як прыходскага святара Альшанскага прыходу.

Пасля адмены ў 1861 г. прыгоннага права ў памесці Альманская Кашара Давыд-Гарадоцкай ардынацыі Радзівілаў у Альманах было 114 рэвізскіх душ. У 31 сялянскім двары па ўстаўной грамаце налічвалі 723 дзесяціны 800 кв. сажняў зямлі. У Пера-

бродах адпаведна 122 рэвізскія душы (35 гаспадарак) і 836 дзесяцін 160 кв. сажняў [36, арк. 2–3; 37, арк. 16–17, 20адв.–21, 24, 28, 34]. У Альманах зямлі, не абложанай выплатай, было 966 дзесяцін 143 кв. сажні, з іх у агульным карыстанні сялян і памешчыка было 507 дзесяцін 905 кв. сажняў зарасляў і 190 дзесяцін 472 кв. сажні няўдобіцы [38, арк. 4]. За сялянамі пакінулі права карыстацца выпасам хатняй жывёлы летам па лясах і балотах памешчыка, восенню – па яго сенажацях, але яно не было замацавана за сялянамі па выкупным акце. Галоўная выкупная установа (Главное выкупное учреждение) зацвердзіла выкупную аперацыю 19 студзеня 1871 г., паводле якой 114 рэвізскіх душ (33 двары) павінны былі на працягу 49 гадоў выплаціць за зямлю (плошчай 560 дзесяцін 2 222 кв. сажні) 3 632 рублі 92 капейкі (штогод па 217 рублёў 97 капеек) [38, арк. 4, 4адв., 44].

Аднак адмежаванне сялянскіх надзелаў ад памешчыцкіх было спрэчным і расцягнулася на дзесяцігоддзі. Спрэчка сялян вёскі Альманы была спынена па добраахвотнай дамове 19 верасня 1892 г. На яе падставе земскім начальнікам праведзена адмежаванне сялянскіх надзелаў ад памешчыцкіх. Усе землі, якія знаходзіліся ў безумоўным валоданні сялян, сталі іх надзеламі. Паводле надзельнага плана 1905 г., у Альманах было 1 826 дзесяцін 480 кв. сажняў зямлі, з іх добрай 1 654 дзесяціны 1 425 кв. сажняў. З агульнай плошчы ворнай зямлі было 888 дзесяцін 950 кв. сажняў, сенакосаў – 157 дзесяцін 2 369 кв. сажняў, выпасу – 6 дзесяцін 816 кв. сажняў, пад забудовамі – 19 дзесяцін 264 кв. сажні, пад вуліцамі і дарогамі – 11 дзесяцін 510 кв. сажняў. Астатняе займалі зараслі (582 дзесяціны 1826 кв. сажняў), балоты (136 дзесяцін 1 кв. сажань), рэкі (24 дзесяціны 648 кв. сажняў), равы (296 кв. сажняў) [39, арк. 54].

**Альманскі прыход у канцы XIX – пачатку XX ст.**

Новая Васкрасенская царква са званіцай у Альманах, узвядзенне якой пачалося ў 1888 г г., была пабудавана *«тщанием прихожан»* у 1893 г. пры свяшчэнніку Міхаіле Пракаповічы. Царква мае падоўжана-восевую кампазіцыю, якая ўключае прытвор-званіцу (два васьмерыкі на чацверыку), прамавугольны бабінец, кубападобную малітоўную залу і прамавугольную апсіду. Над шатром прытвора-званіцы – купал-макаўка, над шатровым дахам малітоўнай залы – цыбулепадобны купал на двух’ярусным васьміграннымым барабане, апсіда мае вальмавае пакрыццё. У царкве тры ганкі пад двухсхільнымі дахамі. Алтарная частка (апсіда) аддзелена ад малітоўнай залы трох’ярусным іканастасам і двума ківотамі.

У 1897 г. у Альманах было 622 жыхары (300 мужчынскага і 322 жаночага полу), з іх праваслаўныя складалі абсалютную большасць (528 чалавек); таксама было 73 асобы іўдзейскага веравызнання (яўрэі) [40, с. 90].

Для характарыстыкі стану Альманскага прыходу ў пачатку XX ст. выкарыстаем ведамасці аб Васкрасенскай царкве ў Альманах за 1901 і 1910 гг.:

*«Зданием деревянная, с такою же колокольнею, крепка. Престол в ней один. В настоящей холодной во имя Воскресения Христова»* [41].

У ведамасці 1910 г. змешчана больш дакладная статыстыка аб царкоўных землях. У царквы сядзібнай зямлі было 1 дзесяціна 2 310 кв. сажняў. Прычтавыя пабудовы для свяшчэнніка і псаломшчыка былі ўзведзены ў 1900 г. на царкоўнай зямлі на казённыя сродкі з новай сасновай драўніны, *«прочные»*. Акрамя таго, царкоўная ворыўная зямля была раскідана па розных урочышчах: Васькаў Рог (3 дзесяціны 2 180 кв. сажняў), Заліпічы (2 дзесяціны 240 кв. сажняў), Люблін (1 дзесяціна 1 056 кв. сажняў), Засоміны (5 дзесяцін 96 кв. сажняў), Язвінка (Язвенцы) (2 дзесяціны 104 кв. сажні), Сталпец (1 дзесяціна 624 кв. сажні), Полішчэ (1 дзесяціна 192 кв. сажні), Крыж (6 дзесяцін 1 080 кв. сажняў), Ніўе (3 дзесяціны 144 кв. сажні), Замаковішча (1 дзесяціна 1 200 кв. сажняў), Забалоцце (2 дзесяціны 2 160 кв. сажняў), Угол (Науголье) (1 дзесяціна 208 кв. сажняў), Хвасцец (3 дзесяціны 864 кв. сажні), Выгорож (1 дзесяціна 1 128 кв. сажняў), Заберцы (2 дзесяціны 2 112 кв. сажняў).

Сенажаці размяшчаліся ва ўрочышчах Вісільнік (1 193 кв. сажні), Кашары (3 дзесяціны 288 кв. сажняў), Лазнішчэ (1 ½ дзесяціны), Пірова Гара (4 дзесяціны 2 352 кв. сажні), Калінікі (2 016 кв. сажняў), Выгорож (432 кв. сажні). Усе яны належалі свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелям. Былі таксама і спрэчныя з Давыд-Гарадоцкай ар-

дынацыяй Радзівілаў землі: ва ўрочышчах Полішчэ (2 112 кв. сажняў), Люблін (4 дзесяціны 472 кв. сажні), Хвасцец (570 кв. сажняў), Сталпец (2 592 кв. сажняў), Чырылаўка (2 дзесяціны 96 кв. сажняў), Васькаў Рог (2 дзесяціны 96 кв. сажняў), але ўсе яны былі ў зараслях. На невялікім царкоўным участку ва ўрочышчы Выгорож пасяліліся яўрэі Ёсель і Аўсей Гурскія, якія плацілі свяшчэнніку па 5 рублёў у год [42].

На ўтрыманне свяшчэнна- і царкоўнаслужыцеляў выдзялялася 509 руб. 16 капеек у год:

*«Содержание их крайне скудно, так как церковная земля, будучи самого плохого качества, расположена на островках среди больших Полесских болот и не может правильно возделываться; сенокосы почти ежегодно заливаются водой и не дают почти доходности причту. Причт сей церкви бедствует без средств своего существования»* [41].

У 1896 г. свяшчэннік Міхаіл Пракаповіч зрабіў вопіс царкоўнай маёмасці. Як сведчаць ведамасці, у царкве захоўваліся копіі метрычных кніг з 1711 г., спавядальныя роспісы – з 1811 г.

У 1908 г. *«тщанием крестьян»* у в. Пераброды была пабудавана царква Св. Тройцы, прыпісаная да Альманскай царквы: *«Зданием деревянная с такою же колокольнею, крепкая»*. У Перабродах заставалася яшчэ капліца *«крайне ветхая, должна быть закрыта»* [42].

Свяшчэннік Міхаіл Васільев[іч] Пракаповіч нарадзіўся 20.12.1866 у сям'і псаломшчыка. У 1889 г. пасля заканчэння Мінскай духоўнай семінарыі ён атрымаў пасведчанне 2-га разраду і быў прызначаны псаломшчыкам у Любязскую царкву Пінскага павета, а 29 верасня 1891 г. быў асвечаны святаром Альманскай Васкрасенскай царквы. Менавіта яму і давялося непасрэдна завяршаць узвядзенне новай царквы. Епіскап Мінскі і Тураўскі Сімяон 25 мая 1899 г. узнагародзіў свяшчэнніка Міхаіла Пракаповіча набедранікам *«за усердное прохождение пастырского служения при добром поведении»*. Жонкай свяшчэнніка была Еўлалія Іванаўна (нар. 17.08.1873). У іх сям'і былі дзеці: Ніна (нар. 14.10.1892), Міхаіл (нар. 10.01.1894), Кацярына (нар. 26.11.1896), Іван (нар. 07.06.1898), Вера (нар. 14.10.1901). У 1901 г. свяшчэннікам было сказана 74 павучэнні, праведзена 76 субяседаванняў [41]. Пасля Альманскага прыходу М. Пракаповіч працягваў святарскую дзейнасць у Лемяшэвіцкім прыходзе Пінскага павета.

29 лістапада 1899 г. указам Мінскай духоўнай кансісторыі псаломшчыкам у Альманскую царкву быў прызначаны Сяргей Уладзіміравіч Акаловіч (нар. 22.01.1881) з сям'і псаломшчыка, які вучыўся ў Мінскім духоўным вучылішчы.

Ён ажаніўся з роднай сястрой альманскага свяшчэнніка Верай Васільеўнай Пракаповіч (нар. 14.02.1884) [41].

Усяго ў Альманскім прыходзе ў 1901 г. было 155 ½ двароў (622 жыхары мужчынскага і 628 жаночага полу). У сяле Альманы было 48 ¼ двары сялян (193 мужчынскага і 206 жаночага полу), ваенных – 16 ¾ двары (67 мужчынскага і 70 жаночага полу). У в. Пераброды (ад Альман *«в 14 верст[ах], весной трудное сообщение»*) сялянскіх двароў было 60 (240 жыхароў мужчынскага і 232 жаночага полу), у ваенных – 17 ¾ двары (71 жыхар мужчынскага і 73 жаночага полу). У Альманскай Кашары (*«в 5 верст[ах], весной трудное сообщение»*) было 7 ¾ двары мяшчан (31 мужчынскага і 27 жаночага полу), 2 двары ваенных (8 мужчынскага і 11 жаночага полу), 3 двары сялян (12 мужчынскага і 9 жаночага полу). З 1894 г. царкоўным старастам служыў альманскі селянін Дзмітрый Ільіч Дзенісовіч. У 1900 г. яго выбралі на трэці тэрмін [41].

У 1903–1904 гг. прыходскім свяшчэннікам быў ***Георгій Пятроў*** [43, с. 195]. У 1904 г., пасля заканчэння па другім разрадзе Мінскай духоўнай семінарыі [31], на яго месца прыбыў ***Герман Ташкоў*** [44, с. 178; 40, с. 188]. Паводле некаторых звестак, Герман Фёдаравіч Ташкоў (1880 г. н.), царкоўнаслужыцель сяла Воласта-Пятніца Смаленскай вобласці, у 1932 г. быў асуджаны да 5 гадоў лагераў, рэабілітаваны ў 1989 г.

У 1906 г. пасля заканчэння па другім разрадзе Мінскай духоўнай семінарыі альманскім свяшчэннікам стаў ***Іуліян (Ульян) Казачэўскі*** [31] і быў ім да 1909 г. [45, с. 178; 46, с. 178; 47, с. 186].

Пасля яго з 1909 г. прыходскім свяшчэннікам быў ***Фёдар Пракаповіч*** [48, с. 172; 49, с. 200; 50, с. 201; 51, с. 204; 52, с. 211; 53, с. 202]. Як сведчыць ведамасць 1910 г., 25 сакавіка 1909 г. епіскап Мінскі і Тураў-

скі Міхаіл рукапалажыў свяшчэннікам Альманскай царквы Фёдара Васільевіча Пракаповіча (нар. 07.06.1871), ураджэнца сяла Лапацін Пінскага павета, брата былога настаяцеля Альманскай царквы Міхаіла Пракаповіча. Ён у 1889 г. скончыў Пінскае духоўнае вучылішча, а ў 1891 г. быў прызначаны псаломшчыкам у Любязскай царкве Пінскага павета замест брата Міхаіла, які пераехаў у Альманы. Ф. Пракаповіч у 1895 г. дабіўся пераводу ў Стахаўскую царкву, у 1900 г. – у Церабяжоўскую царкву таго ж Пінскага павета, а 3 лютага 1908 г. рукапаложаны ў сан дзякана. За актыўны ўдзел у Першым усеагульным перапісе насельніцтва 1897 г. ён быў узнагароджаны бронзавым медалём, а ў 1908 г. – медалём Чырвонага Крыжа *«в память участия в деятельности во время русско-японской войны 1904–1905 года»*. Быў у шлюбе з Надзеяй Андрыянаўнай (нар. 17.10.1874). У іх сям'і былі дзеці: Еўлалія (нар. 06.08.1894), Ганна (нар. 02.02.1900), Андрэй (нар. 02.10.1902), Мікалай (нар. 04.05.1904), Павел (нар. 04.01.1909). Старэйшыя дзеці вучыліся ў царкоўна-прыходскай школе [42].

Псаломшчык Фама Кандратавіч Гурскі (нар. 24.04.1882), сын селяніна, скончыў народнае вучылішча. 7 лістапада 1908 г. быў прызначаны епіскапам Мінскім і Тураўскім Міхаілам псаломшчыкам у Альманскую царкву. У яго сям'і была жонка Анастасія Іосіфаўна (нар. 22.04.1883) і іх сын Леанід (нар. 07.01.1910).

У 1910 г. у Альманскім прыходзе ўжо налічвалася 185 ½ двара (742 жыхары мужчынскага і 771 жаночага полу), з іх у Альманах – 85 ¼ двара сялян (341 мужчынскага і 307 жаночага полу), у Перабродах – 88 ¼ двара (353 жыхары мужчынскага і 411 жаночага полу), у Альманскай Кашары – 7 ½ двара мяшчан (30 мужчынскага і 35 жаночага полу), 3 ¼ двара ваенных (13 мужчынскага і 14 жаночага полу), 1 ¼ двара духавенства (5 чалавек мужчынскага і 4 жаночага полу). З 1908 г. царкоўным старастам быў альманскі селянін Стэфан (Сцяпан) Калінікав[іч] Буян [42].

Працягвалася ўрэгуляванне пазямельных адносін з Давыд-Гарадоцкай ардынацыяй Радзівілаў, бо сяляне былі незадаволены адмежаваннем пашы па сервітуту. Пінскі павятовы з'езд 18 верасня 1910 г. вырашыў зацвердзіць межавыя дакументы, але паверанымя сялян прасілі прадоўжыць ім тэрмін абскарджвання гэтага рашэння. Мінская губернская па сялянскіх справах присутнасць вярнула гэтую справу ў Пінскі павятовы з'езд для канчатковага выпраўлення і дапаўнення межавых дакументаў і чарцяжу [36, арк. 163адв.]. Скарга паверанных сялян вёскі Альманы Дзмітрыя Дзенісовіча і Сцяпана Буяна аб адмежаванні сялянскіх зямель гэтай вёскі ад зямель памесця Альманская Кашара князя С. Радзівіла разглядалася 29 студзеня 1913 г. Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасцю. Канчаткова кропку паставіў Сенат, які ўказам ад 7 мая 1915 г. прызнаў скаргу *«не заслуживающей уважения»*, таму і адпаведны вердыкт: *«Жалобу оставить без последствий»* [36, арк. 167адв.].

У 1916 г. прыходскім свяшчэннікам у Альманах быў ***Аляксандр Раздзялоўскі*** [54, с. 186].

**Заключэнне**

У ходзе даследавання нам удалося ўстанавіць шэраг свяшчэннікаў-настаяцеляў Альманскага праваслаўнага прыходу ў канцы XVIII – пачатку XX ст.: Канстанцін Яхімовіч (да 1793 г.), Іаан Сулкоўскі (не пазней за 1793 г. – не раней за 1795 г.), Канстанцін Раздзялоўскі (1815 – не раней 1826 г.), Іуліян Лісіцкі (не пазней за 1868 г. – 1868 г.), Павел Пякарскі (1882–1891 гг.), Міхаіл Пракаповіч (1891–1903 гг.), Гергій Пятроў (1903–1904 гг.), Герман Ташкоў (1904–1906 гг.), Іуліян Казачэўскі (1906–1909 гг.), Фёдар Пракаповіч (1909 – не раней за 1915 г.), Аляксандр Раздзялоўскі (не пазней за 1916 г. – ?). Безумоўна, гэты спіс няпоўны па прычыне фрагментарнасці крыніц, таму трэба працягваць іх пошук. Атрыманыя асабовыя звесткі пра свяшчэннікаў, царкоўнаслужыцеляў і іх сем'і могуць выкарыстоўвацца для далейшых гісторыка-краязнаўчых і генеалагічных даследаванняў.

Абсалютную большасць вернікаў складалі незаможныя мясцовыя сяляне. Таму прычту даводзілася разлічваць не толькі на штатнае гадавое «жалование», але і на скупы прыбытак ад царкоўнай зямлі, якая апрацоўвалася ці здавалася ў арэнду. Прыходскае духавенства, царкоўнаслужыцелі жылі пераважна ў бядоце. Нягледзячы на гэта, яны спраўна выконвалі свае багаслу-

жэбныя абавязкі, займаліся асветніцкай працай (у 1844 г. пачало працаваць «поселянское училище», а ў другой палове XIX ст. – царкоўнапрыходская школа). Намаганнямі вернікаў і прычту ў 1893 г. была пабудавана новая царква ў Альманах, у 1908 г. – у Перабродах.

Узаемаадносіны з Давыд-Гарадоцкай ардынацыяй Радзівілаў былі няпростымі. З аднаго боку, для Альманскай царквы ў 1772 г. князь Іосіф Радзівіл ахвяраваў зямельны ўчастак. З другога боку, у парэформенны перыяд зацягнуты спрэчны характар мела ўрэгуляванне адмежавання надзелаў сялян з памешчыкам і пытанне сервітутаў.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Памяць: Столінскі раён : гіст.-дакум. хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 635 с.

2. Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя : у 15 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2007. – Т. 4 : Брэсцкая вобласць. Кн. 2 / пад навук. рэд. А. І. Лакоткі. – 607 с.

3. Вярэніч, В. Л. Палескі архіў: лінгвістычныя, этнаграфічныя і гістарычныя матэрыялы / В. Л. Вярэніч ; пад навук. рэд. Ф. Клімчука, Э. Смулковай і А. Энгелькінг. – Мінск, 2009. – 691 с.

4. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) / навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 339 с.

5. Кулагін, А. М. Праваслаўныя храмы на Беларусі : энцыкл. давед. / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2001. – 328 с.

6. Мароз, В. В. Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны: нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2018. – 512 с.

7. Ильин, А. Л. Очерки истории культуры Пинщины (IX – нач. XX вв.) / А. Л. Ильин, Е. А. Игнатюк. – Пинск : ПолесГУ, 2013. – 220 с.

8. Вабищевич, А. Н. Состояние православных приходов на Полесье в середине XIX в. (на примере Рубельского прихода Мозырского уезда) / А. Н. Вабищевич // VI навуковакраязнаўчая канферэнцыя «Пружанскі дыярыуш». – Брэст : Выд-ва БрДТУ, 2017. – С. 15–21.

9. Вабищевич, А. Н. Рубельский православный приход на Столинщине (конец XVIII – начало XX в.) / А. Н. Вабищевич // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2018. – № 1. – С. 17–27.

10. Музей старажытнабеларускай культуры. – Мінск : Беларусь, 2004. – 278 с.

11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 333. Воп. 9. Спр. 55.

12. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 1740.

13. Ведомость епархии и губернии Минской повета и ведомства Пинского духовного правления, села Ольман, Воскресенской церкви, о священно- и церковнослужителях и их обоего пола детях за 1826-й год сочиненная // Асабісты архіў А. М. Вабішчэвіча.

14. НГАБ. – Ф. 694. Воп. 2. Спр. 11001.

15. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / Я. К. Анішчанка [і інш.] ; пад рэд. В. І. Мялешкі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – 431 с.

16. Свидетельство Давид-Городокской ординации Радзивиллов А. П. Буяну от 25 января 1844 г. // Асабісты архіў А. М. Вабішчэвіча.

17. Восович, С. М. Церковные школы ведомства православного исповедания в Минской епархии в 30-х гг. XIX – начале XX века / С. М. Восович // Вестн. Брест. гос. техн. ун-та. Сер.: Гуманитар. науки. – 2003. – № 6. – С. 69–73.

18. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 18335.

19. НГАБ. – Ф. 136. Воп. 1. Спр. 19453.

20. Историко-статистическое описание Минской епархии, составленное ректором Минской духовной семинарии, архимандритом Николаем. – СПб. : Тип. духов. журн. «Странник», 1864. – [4], 315 с.

21. Минские епархиальные ведомости. – 1868. – 15 сент.

22. Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтов сведениям (Приложение к «Минским епархиальным ведомостям» за 1879 г.). – Минск : Типо-литогр. Б. И. Соломонова, 1879. – VI. Пинский уезд. – 210 с.
23. Памятная книжка Минской губернии на 1883 год. – Минск : Тип. Р. Дворжец, 1882. – V, 3–335, XXII с.
24. Памятная книжка Минской губернии на 1884 год. – Минск : Тип. Р. Дворжец, 1883. – V, 333, XXI с.
25. Памятная книжка Минской губернии на 1885 год. – Минск : Тип. Р. Дворжец, 1884. – V, 327, XXIV с.
26. Памятная книжка Минской губернии на 1886 год. – Минск : Типо-литогр. Р. Дворжец, 1885. – V, 251, CXXIV с.
27. Памятная книжка Минской губернии на 1887 год. – Минск : Типо-литогр. Р. Дворжец, 1886. – 342 с.
28. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1888 год. – Минск : Мин. губерн. тип., 1887. – 345, V [2] с.
29. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1889 год. – Минск : Мин. губерн. тип., 1888. – 349, III [6] с.
30. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1890 год. – Минск : Типо-литогр. Б. И. Соломонова, 1889. – LXIV, 221, 137, [8] с.
31. Выпускники Минской духовной семинарии 1869, 1871, 1873, 1875, 1876, 1880–1915 гг. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://petergen.com/bovkalo/duhov/minsksem.html. – Дата доступа: 28.03.2024.
32. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1892 високосный год. – Минск : Губерн. тип., 1891. – XLIV, 196, 168, [4] с.
33 Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1893 год. – Минск : Типо-литогр. Тасьмана и Левина, 1892. – XLIV, 222, 40 с.
34. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1902 год. – Минск : Паровая типо-литогр. Б. И. Соломонова, 1901. – 218, 212, [7] с.
35. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1903 год. – Минск : Паровая типо-литогр. Б. И. Соломонова, 1902. – 216, 208, [9] с.
36. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 2. Спр. 770.
37. НГАБ. – Ф. 242. Воп. 2. Спр. 825.
38. Российский государственный исторический архив (РГИА). – Ф. 577. Оп. 18. Д. 1334.
39. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 1259.
40. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1906 год. – Минск : Губерн. тип., 1905. – [5], 211, 193, [4] с.
41. Ведомость о церкви Свято-Воскресенской, Пинского уезда, Минской губернии, 3-го благочиннического округа, села Ольман за 1901 год // Асабісты архіў А. М. Вабішчэвіча.
42. Ведомость о церкви села Ольман Св[ято]-Воскресенской 3-го благочиннического округа, Пинского уезда, Минской епархии за 1910 год // Асабісты архіў А. М. Вабішчэвіча.
43. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1904 год (високосный). – Минск : Паровая типо-литогр. Б. И. Соломонова, 1903. – 221, 157, [3], 68, [6] с.
44. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1905 год. – Минск : Паровая типо-литогр. Б. И. Соломонова, 1904. – [5], 201, 200, [6] с.
45. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1907 год. – Минск : Губерн. тип., 1906. – [5], 200, 207, [15] с.
46. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1908 год (високосный). – Минск : Тип. С. А. Некрасова, 1907. – [8], 200, 163, [15] с.
47. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1909 год. – Минск : Тип. С. А. Некрасова, 1908. – [10], 208, 189, [3] с.
48. Памятная книжка Минской губернии и календарь на 1910 год. – Минск : Губерн. тип., 1909. – 192, 187, III, [2] с.
49. Памятная книжка Минской губернии и календарь на 1911 год. – Минск : Губерн. тип., 1910. – 224, 138, II, [2] с.

50. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1912 год. – Минск : Губерн. тип., 1911. – 224, 211, III, [6] с.
51. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1913 год. – Минск : Губерн. тип., 1912. – 232, 197, III, [2] с.
52. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1914 год. – Минск : Губерн. тип., 1913. – 37, 240, 189, III, [2] с.
53. Памятная книжка и календарь Минской губернии на 1915 год. – Минск : Губерн. тип., 1914. – 232, 185, III, [26] с.
54. Памятная книжка Минской губернии и календарь на 1917 год. – Минск : Тип. инвалидов, 1916. – 248, [1] с.

REFERENCES

1. Pamiac’: Stolinski rajon : hist.-dakum. khroniki haradou i rajonau Bielarusi. – Minsk : BELTA, 2003. – 635 s.
2. Harady i vioski Bielarusi : encyklapiedyja : u 15 t. / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru. – Minsk : Bielarus. encykl. imia Pietrusia Brouki, 2007. – T. 4 : Bresckaja voblasc’. Kn. 2 / pad navuk. red. A. I. Lakotki. – 607 s.
3. Viarenich, V. L. Palieski arkhiu: linhvistychnyja, etnahrafichnyja i histarychnyja materyjaly / V. L. Viarenich ; pad navuk. red. F. Klimchuka, E. Smulkovaj i A. Enhiel’kinh. – Minsk, 2009. – 691 s.
4. Kanfiesii na Bielarusi (kaniec XVIII – XX st.) / navuk. red. U. I. Navicki. – Minsk : Ekapierspiektyva, 1998. – 339 s.
5. Kulahin, A. M. Pravaslaunyja khramy na Bielarusi : encykl. davied. / A. M. Kulahin. – Minsk : BielEN, 2001. – 328 s.
6. Maroz, V. V. Draulianyja sakral’nyja pomniki Bierasciejshchyny: narysy historyi, arkhiealohii i kul’tury / V. V. Maroz. – Minsk : Bielarus. Encykl. imia Pietrusia Brouki, 2018. – 512 s.
7. Il’in, A. L. Ochierki istorii kul’tury Pinshchiny (IX – nach. XX vv.) / A. L. Il’in, Ye. A. Ignatiuk. – Pinsk : PoliesGU, 2013. – 220 s.
8. Vabishchievich, A. N. Sostojanije pravoslavnykh prikhodov na Polies’je v sieriedinie XIX v. (na primierie Rubiel’skogo prikhoda Mozyrskogo ujezda) / A. N. Vabishchievich // VI Navukova-krajaznauchaja kanfieriencyja «Pruzhanski dyjaryush». – Brest : Vyd-va BrDzTU, 2017.– S. 15–21.
9. Vabishchievich, A. N. Rubiel’skij pravoslavnyj prikhod na Stolinshchinie (koniec XVIII – nachalo XX v.) / A. N. Vabishchievich // Viesn. Bresc. un-ta. Sier. 2. Historyja. Ekanomika. Prava. – 2018. – № 1. – S. 17–27.
10. Muziej starazhytnabielaruskaj kul’tury. – Minsk : Bielarus’, 2004. – 278 s.
11. Nacyjanal’ny histarychny arkhiu Bielarusi (NHAB). – F. 333. Vop. 9. Spr. 55.
12. NHAB. – F. 694.Vop. 2. Spr. 1740.
13. Viedomost’ jeparkhii i gubiernii Minskoj povieta i viedomstva Pinskogo dukhovnogo pravlienija, siela Ol’man, Voskriesienskoj cerkvi, o sviashchienno- i cerkovnosluzhitieliakh i ikh obojego pola dietiakh za 1826-j god sochiniennaja // Asabisty arkhiu A. M. Vabishchevicha.
14. NHAB. – F. 694.Vop. 2. Spr. 11001.
15. Historyja sialianstva Bielarusi : u 3 t. – Minsk : Bielarus. navuka, 1997. – T. 1 : Historyja sialianstva Bielarusi ad starazhytnasci da 1861 h. / Ya. K. Anishchanka [i insh.] ; pad red. V. I. Mialieshki [i insh.]. – 431 s.
16. Svidietiel’stvo David-Gorodokskoj ordinacii Radzivillov A. P. Bujanu ot 25 janvaria 1844 g. // Asabisty arkhiu A. M. Vabishchevicha.
17. Vosovich, S. M. Cerkovnyje shkoly viedomstva pravoslavnogo ispoviedanija v Minskoj jeparkhii v 30-kh gg. XIX – nachalie XX vieka / S. M. Vosovich // Viestn. Briest. gos. tiekhn. un-ta. Sier.: Gumanitar. nauki. – 2003. – № 6. – S. 69–73.
18. NHAB. – F. 136. Vop. 1. Spr. 18335.
19. NHAB. – F. 136.Vop. 1. Spr. 19453.
20. Istoriko-statistichieskoje opisanije Minskoj jeparkhii, sostavliennoje riektorom Minskoj dukhovnoj sieminarii, arkhimandritom Nikolajem. – SPb. : Tip. dukhov. zhurn. «Strannik», 1864. – [4], 315 s.

21. Minskije jeparkhial'nyje viedomosti. – 1868. – 15 sient.
22. Opisanije cerkviej i prikhodov Minskoj jeparkhii, sostavliennoje po oficial'no zatriebovannym ot prichtov sviedienijam (Prilozhenije k «Minskim jeparkhial'nym viedomostiam» za 1879 g.). – Minsk : Tipo-litogr. B. I. Solomonova, 1879. – VI. Pinskij ujezd. – 210 s.
23. Pamiatnaja knizhka Minskoj gubiernii na 1883 god. – Minsk : Tip. R. Dvorzhec, 1882. – V, 3–335, XXII s.
24. Pamiatnaja knizhka Minskoj gubiernii na 1884 god. – Minsk : Tip. R. Dvorzhec, 1883. – V, 333, XXI s.
25. Pamiatnaja knizhka Minskoj gubiernii na 1885 god. – Minsk : Tip. R. Dvorzhec, 1884. – V, 327, XXIV s.
26. Pamiatnaja knizhka Minskoj gubiernii na 1886 god. – Minsk : Tipo-litogr. R. Dvorzhets, 1885. – V, 251, CXXIV s.
27. Pamiatnaja knizhka Minskoj gubiernii na 1887 god. – Minsk : Tipo-litogr. R. Dvorzhec, 1886. – 342 s.
28. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1888 god. – Minsk : Min. gubiern. tip., 1887. – 345, V [2] s.
29. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1889 god. – Minsk : Min. gubern. tip., 1888. – 349, III [6] s.
30. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1890 god. – Minsk : Tipo-litogr. B. I. Solomonova, 1889. – LXIV, 221, 137, [8] s.
31. Vypuskniki Minskoj dukhovnoj sieminarii 1869, 1871, 1873, 1875, 1876, 1880–1915 gg. [Eliektronnyj riesurs]. – Riezhim dostupa: http://petergen.com/bovkalo/duhov/minsksem.html. – Data dostupa: 28.03.2024.
32. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1892 visokosnyj god. – Minsk : Gubiern. tip., 1891. – XLIV, 196, 168, [4] s.
33. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1893 god. – Minsk : Tipo-litogr. Tas'mana i Lievina, 1892. – XLIV, 222, 40 s.
34. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1902 god. – Minsk : Parovaja tipo-litogr. B. I. Solomonova, 1901. – 218, 212, [7] s.
35. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1903 god. – Minsk : Parovaja tipo-litogr. B. I. Solomonova, 1902. – 216, 208, [9] s.
36. NHAB. – F. 242. Vop. 2. Spr. 770.
37. NHAB. – F. 242. Vop. 2. Spr. 825.
38. Rossijskij gosudarstviennyj istorichieskij arkhiv. – F. 577. Op. 18. D. 1334.
39. Dziarzhauny arkhiu Bresckaj voblasci. – F. 60. Vop. 1. Spr. 1259.
40. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1906 god. – Minsk : Gubiern. tip., 1905. – [5], 211, 193, [4] s.
41. Viedomost' o cerkvi Sviato-Voskriesienskoj, Pinskogo ujezda, Minskoj gubiernii, 3-go blagochinnichieskogo okruga, siela Ol'man za 1901 god // Asabisty arkhiu A. M. Vabishchevicha.
42. Viedomost' o cerkvi siela Ol'man Sv[iato]-Voskriesienskoj 3-go blagochinnichieskogo okruga, Pinskogo ujezda, Minskoj jeparkhii za 1910 god // Asabisty arkhiu A. M. Vabishchevicha.
43. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1904 god (visokosnyj). – Minsk : Parovaja tipo-litogr. B. I. Solomonova, 1903. – 221, 157, [3], 68, [6] s.
44. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1905 god. – Minsk : Parovaja tipo-litogr. B. I. Solomonova, 1904. – [5], 201, 200, [6] s.
45. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1907 god. – Minsk : Gubiern. tip. – [5], 200, 207, [15] s.
46. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1908 god (visokosnyj). – Minsk : Tip. S. A. Niekrasova, 1907. – [8], 200, 163, [15] s.
47. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1909 god. – Minsk : Tip. S. A. Niekrasova, 1908. – [10], 208, 189, [3] s.
48. Pamiatnaja knizhka i kaliendar' Minskoj gubiernii na 1910 god. – Minsk : Gubiern. tip., 1909. – 192, 187, III, [2] s.

49. Pamiatnaja knizhka i kaliendar’ Minskoj gubiernii na 1911 god. – Minsk : Gubiern. tip., 1910. – 224, 138, II, [2] s.
50. Pamiatnaja knizhka i kaliendar’ Minskoj gubiernii na 1912 god. – Minsk : Gubiern. tip., 1911. – 224, 211, III, [6] s.
51. Pamiatnaja knizhka i kaliendar’ Minskoj gubiernii na 1913 god. – Minsk : Gubiern. tip., 1912. – 232, 197, III, [2] s.
52. Pamiatnaja knizhka i kaliendar’ Minskoj gubiernii na 1914 god. – Minsk : Gubiern. tip., 1913. – 37, 240, 189, III, [2] s.
53. Pamiatnaja knizhka i kaliendar’ Minskoj gubiernii na 1915 god. – Minsk : Gubiern. tip., 1914. – 232, 185, III, [26] s.
54. Pamiatnaja knizhka i kaliendar’ Minskoj gubiernii na 1917 god. – Minsk : Tip. invalidov, 1916. – 248, [1] s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 08.04.2024*